**Ляпешкін Яўген Мікалаевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# У. А. ДРУЦКОЙ-САКАЛІНСКІ — АПОШНІ МІНСКІ ГУБЕРНАТАР

Уладзімір Андрэевіч Друцкой-Сакалінскі (1880—1943) нарадзіўся ў С. — Пецярбурзе, паходзіў са старажытнага княжацкага роду. Выпускнік Імператарскага вучылішча правазнаўства. Праваслаўнага веравызнання [4, с. 116].

Новы мінскі губернатар на пасаду ўступіў 5 верасня 1916 г., хаця прызначэнне адбылося яшчэ 15 жніўня [4, с. 117].

Да гэтага перамяшчэння служыў тры гады магілёўскім віцэ-губернатарам. Меў шматгадовы вопыт службы на розных чыноўніцкіх пасадах па ведамству Міністэрства ўнутраных спраў у Петракоўскай (тэрыторыя Польшчы) і Кастрамской губернях [4, с. 116—117].

У канцы 1916 г. атрымаў чын сапраўднага стацкага саветніка і званне камергера Двара Яго Імператарскай Вялікасці [4, с. 117].

Губернатарства У. А. Друцкога-Сакалінскага прыпала на цяжкі час. Ішла Першая сусветная вайна і Мінская губерня знаходзілася на ваенным становішчы, праз яе праходзіў фронт. Кіруючыя пазіцыі тут належылі вайскоўцам. Сярод іх: камандуючы Заходнім фронтам А. Е. Эверт, галоўны начальнік забеспячэння генерал М. Я. Туманаў, галоўны начальнік Мінскай ваеннай акругі на тэатры ваенных дзеянняў Я. А. Рауш фон Траубенберг. З імі мінскі губернатар павінен быў лічыцца пад час свайго кіравання. Але і вайсковае кіраўніцтва вымушана было ставіцца да губернатара ўважліва. Праўда, не таму што ён уяўляў грамадзянскае начальства губерні, а з-за яго сувязяў з высокапастаўленымі асобамі дзяржавы [3, с. 193].

Пры гэтым У. А. Друцкой-Сакалінскі прызнаваўся, што «быў значна больш вольны ў сваіх дзеяннях, чым любы губернатар у мірны час». Ён лічыў, што кантанкты з галоўным для яго военачальнікам М. Я. Туманавым дазволяць яму пры неабходнасці скарыстацца надзвычайнымі правамі вайскоўцаў [3, с. 120]. Што і ажыццяўлялася на практыцы.

Пасля спецыяльнага расследавання ў Бабруйску мінскі губернатар даведаўся аб тым, што мясцовая паліцыя за хабар дазваляла праводзіць яўрэям незаконна гандлёвыя аперацыі са спіртам. У выніку У. А. Друцкой-Сакалінскі жорстка расправіўся з вінаватымі. Са службы былі звольнены ўсе класныя чыны, прыставы і іх памочнікі. Бабруйскі паліцмайстар быў адпраўлены па этапу за межы еўрапейскай Расіі. Апошні ўчынак быў здзейснены губернатарам ад імя галоўнага начальніка забеспячэння. Калі мінскі губернатар паведаміў аб справе М. Я. Туманаву, той быў толькі задаволены разгромам злачыннай арганізацыі [3, с. 126—128]. Такім чынам, мінскі губернатар сапраўды мог і выкарыстоўваў надзвычайныя паўнамоцтвы вайскоўцаў у сваім кіраванні губерняй.

Трэба пагадзіцца, што па сваіх палітычных поглядах мінскі губернатар з'яўляўся манархістам і нацыяналістам [1, с. 336]. «Я хачу і для Расіі наогул правадыра, а не Думу, — пісаў У. А. Друцкой-Сакалінскі ва ўспамінах, — а для кожнай расійскай губерні — губернатара, а не савет» [3, с. 135]. З чаго вынікае,

што ён не лічыў патрэбным рэфармаваць інстытут губернатарства. Больш таго, ён хацеў вярнуць тыя часы, калі губернатар быў залежны фактычна толькі ад манарха. Таму мінскі начальнік быў незадаволены тым, што менавіта Міністэрства ўнутраных спраў стала ўплываць на прызначэнне і звальненне губернатара [3, с. 132].

У. А. Друцкой-Сакалінскі дбаў пра інтарэсы Мінскай губерні, як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, якую яму даручылі ў кіраванне. Напрыклад, яго хвалявала незадавальняючае харчовае становішча мясцовага насельніцтва ў канцы 1916 г. «Губерня мая не толькі недаатрымлівае належнай ёй месячнай нормы харчовых грузаў, але і дастаўка такіх была амаль цалкам спыненая», — пісаў ён ва ўспамінах. Для вырашэння гэтага і іншых пытанняў губернатар нават ездзіў у С. — Пецярбург [3, с. 234, 245]. Але ж мінскі начальнік турбаваўся пра людзей не столькі з гуманістычных поглядаў, колькі з палітычных, прагматычных. Ён разумеў, што праблемы з харчаваннем выклікалі ў людей незадавальненне і рост антыдзяржаўных настрояў [3, с. 234]. Для яго важным быў у першую чаргу ўзровень лаяльнасці насельніцтва да ўладаў, а ўжо потым інтарэсы жыхароў губерні. Больш таго, У. А. Друцкой-Сакалінскі глядзеў на губерню, як на сваю ўласнасць, няхай і часовую, пра якую, як пэўны ўласнік і дбаў. У сувязі з чым ён выкарыстоўваў словазлучэнні: «мая губерня», «мае мінчане» і г. д.

Аналізуючы рэтраспектыўна інстытут губернатарства, У. А. Друцкой-Сакалінскі адзначаў у сваіх нататках, што «губернатарская магістратура» глядзіць на губерню, як на сваю вотчыну, уласнасць. І ён ацэньвае гэты стан пазітыўна: улады да свайго ўласнага і роднага будуць адносіцца станоўча — гэта і будзе стымулам для іх плённай працы [3, с. 129—130].

У Мінску У. А. Друцкой-Сакалінскі для паляпшэння харчовай сітуацыі змагаўся са спекуляцыяй. Так, па яго ініцыятыве вайсковае кіраўніцтва загадала двух спекулянтаў харчаваннем Поляка і Суціна выслаць ў Сібір па этапу [3, с. 167].

Кіраўніцтва Сельскай харчовай часці Міністэрства ўнутраных спраў звярнулася ў верасні 1916 г. да мінскага губернатара з тым, каб сфармаваць пад яго старшынствам «Губернскую нараду для распрацоўкі і абмеркавання шэрагу пытанняў, звязаных з арганізацыяй неабходнай дзяржаўнай дапамогі насельніцтву ў мясцовасцях, вызваленых ад ворага» [5, арк. 104]. У кастрычніку 1916 г. ужо міністр земляробства прасіў мінскага начальніка аб скліканні «Асобнай па сельскаму будаўніцтву нарады для вызначэння памераў будаўнічай дапамогі, якая можа спатрэбіцца сельскаму насельніцтву ў пацярпелых ад варожага нашэсця мясцовасцях Мінскай губерні і вызначэння спосабаў аказання такой дапамогі ў адпаведнасці з мясцовымі асаблівасцямі» [5, арк. 108]. Акрамя гэтых бюракратычных захадаў адбываліся і рэальныя дзеянні па паляпшэнню становішча пацярпелых ад вайны жыхароў. Прычым У. А. Друцкому-Сакалінскаму не раз прыходзілася дзейнічаць хутка, а таму самастойна, беручы ўсю адказнасць ня сябе.

Так, галоўны мінскі чыноўнік па прычыне блізкасці тэатра ваенных дзеянняў і адпаведна небяспекі для насельніцтва, рассяліў пінскіх сялян далей ад фронта па казённых лясніцтвах. Калі аб гэтым даведаліся ў Галоўным кіраўніцтве земляробства, то адтуль патрабавалі тлумачэння такіх дзеянняў без дазволу ведамства [3, с. 232].

У. А. Друцкой-Сакалінскі быў прызначаны ў губерню, якая з'яўлялася цэнтрам арэала этнічнага рассялення беларусаў. Але захадаў па адкрыццю беларускамоўных школ, напрыклад, ён не рабіў. І гэта абсалютна зразумела, паколькі па сваіх поглядах належыў да манархістаў. У той час, як на акупаванай немцамі тэрыторыі, напрыклад, у г. Вільне, адчыняліся беларускамоўныя школы, мінскі губернатар не пажадаў уздымаць «нацыянальнае пытанне» [2, с. 451—452].

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. прывяла да таго, што 4 сакавіка служба У. А. Друцкога-Сакалінскага на пасадзе мінскага губернатара скончылася. Ён павінен быў перадаць кіраванне губерняй старшыні губернскай управы Б. Н. Самойленка, які стаў мінскім губернскім камісарам [1, с. 337].

Такім чынам, пасаду апошняга мінскага губернатара займаў чалавек не мясцовага паходжання, рускі па нацыянальнасці, манархіст па палітычных поглядах. Але гэта быў здольны адміністратар і адданы трону чыноўнік, які дбаў у першую чаргу пра інтарэсы ўлады, а не беларусаў — асноўнай часткі насельніцтва Мінскай губерні.

**Крыніцы і літаратура.**

1. Бригадин, П. И. Минские губернаторы: история власти / П. И. Бригадин, А. М. Лукашевич. — Минск: ГИУСТ БГУ, 2009. — 351 с.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII—пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. — Мінск: Экаперспектыва, 2007. — 519 с.; іл.

3. Друцкой-Соколинский, В.А., князь. На службе Отечеству. Записки рус. губернатора (1914—1918 гг.) / Сост. А. В. Воробьев; ред. А. В. Богданчиков. — Орел: РКФ «3 июля»: РИГ «Невероятный мир», 1994. — 405 с., 2 л. ил.

4. Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства (1793—1917): биографический справочник / сост. Ю. Н. Снапковский; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. — Минск: Беларусь, 2016. — 398 с., [2] л.: ил.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Фонд 299. — Воп. 7. — Спр. 530. Дело о службе Минского вице-губернатора коллежского советника Н. А. Астафьева (17.03.1915—14.01.1917).

**Маслоўскі Яўген Валер'евіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ДАБРАЧЫННЫЯ ТАВАРЫСТВЫ Ў ПАЎСЯДЗЁННЫМ ЖЫЦЦІ РАБОЧЫХ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ НАПЯРЭДАДНІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Напярэдадні Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў узнікла і існавала вялікая колькасць дабрачынных і грамадскіх арганізацый, якія аказвалі моцны ўплыў на жыццё тагачасных рабочых губерні. Дабрачынныя таварыствы былі прадстаўлены ва ўсіх сферах жыцця рабочых: дзіцячыя садкі-яслі, таварыствы беспрацэнтнага крэдыту, пахавальныя таварыствы і інш. Дадзеная сітуацыя абгрунтоўваецца тым, што на большасць сфер жыцця рабочых не была абаронена і дзяржава імкнулася перакласці вырашэнне гэтых пытанняў на дабрачынныя таварыствы.